## Спасылкі:

[1] Гніламёдаў У. Янка Купала: Новы погляд. — Мн.: Нар. асвета, 1995. — С.81.

[2] Васючэнка П. Драматургічная спадчына Янкі Купалы: Вопыт сучасн. прачытання. — Мн.: Навука і тэхніка, 1994. — С.169.

[3] Калесник В. // Неман. — 1994. — № 11. — С.45.

[4] Янка Купала. Збор твораў: У 7 т. Вершы, пераклады. — Мн., 1973. Т.3. — С. 149. Далей спасылкі на гэтае выданне (з указаннем тома і старонак) прыводзяцца ў тэксце.

[5] Чыквін Ян. Кругавая пара. — Беласток, 1992. — С.7.

[6] Тамсама. — С.22.

[7] Тамсама. — С.9.

[8] Тамсама. — С.48.

*І.М.Гоўзіч*
*(Мінск)*

## "ЧЫСЦІНЁЙ СВЯТЛІЦЦА СЛОВА..."
## *(КУПАЛАВЫ ВОБРАЗАТВОРЧЫЯ ТРАДЫЦЫІ Ў ЛІРЫЦЫ ЯНКІ СІПАКОВА)*

Янка Купала стварыў шматгранную мастацкую рэальнасць паводле асэнсавання драматычнага жыцця першай паловы XX стагоддзя і неабмежаванай, крылатай фантазіі. Дзякуючы яму мы пазналі сябе і ўвесь свет, свой менталітэт, сваю нацыянальную гісторыю і гісторыю іншых народаў свету. Адным словам, творчасць Купалы сталася для нас магутным сродкам пазнання сэнсу жыцця ў яго шматгранных стасунках. Таму і сёння прыпадаем да яе, каб наталіць прагу ведаць як мага больш, разумець і цаніць высокай мерай тое, што ў нас саміх і па-за намі. І для пісьменнікаў усіх наступных пакаленняў іх славуты папярэднік застанецца яскравым прыкладам таго, як сур'ёзна, неаблегчана, грунтоўна мастак павінен перасатвараць рэчаіснасць у новы, мастацкі сімвал яе, у адрозна-падобную мадэль у слове.

Агульнафіласофскі падыход класіка нашай нацыянальнай літаратуры да мастацкай творчасці як сродка не толькі спасціжэння, а і перасатварэння (упадабнення – яшчэ паводле выказвання Арыстоцеля) рэчаіснасці ў асноўным успрыняла пазнейшая беларуская літаратура. Найперш гэта відаць з таго, што яна не абмежавалася натуралістычна-прыземленым

апісаннем з'яваў, а ўзнялася над імі на крылах вымыслу, узвысіла іх да эстэтычна значных, надтачыла "заганнасць" прагназаваннем будучай гармоніі, выклікала ў чытача давер да гуманістычных ідэалаў, якія аказаліся не ў стане знішчыць канчаткова трывожнае XX стагоддзе. Аднак не меншы ўплыў на пазнейшую беларускую літаратуру Купала аказаў і па многіх канкрэтных пазіцыях, параметрах. Так, да прыкладу, менавіта яго чуйнае адчуванне слова, трапяткое жаданне выявіць праз яго незвычайнасць і напружанасць сітуацыі шматгалоссе жыцця (у "Паязджанах" гэта словы "праслух", "праглед", "сцюжны" пух, "сцюжная" мара, злога духа "злыбядуха", у полі "беспатольна і заломна", ні пуціны, ні "ўпыння", "дняванне", завіруха – "збеядуха"). Падобныя ж адносіны да тропаў, многія з якіх перарастаюць сябе і ператвараюцца ў філасофска-значныя мастацкія дэталі, што праліваюць святло на ідэю і асобных твораў, і паэтавай творчасці ў цэлым (як, да прыкладу, трагедыйна-значнае параўнанне сітуацыі ў жыцці краіны і ў жыцці прыроды ў тых самых "Паязджанах" — "Ні пуціны, ні ўпыння, Як у вечнай дамавіне" ці не менш шматзначнае ўжо пад другі, радасны настрой, выкліканы верай у народ і яго здольнасць супрацьстаяць трагедыйным абставінам і раскрыцца з лепшага боку ў самых жорсткіх умовах у "Жняі" параўнанне вясковай дзяўчыны з царыцай – "Як сама царыца, У залатой кароне"), умельства ўбачыць у кроплі "цэлы свет" таксама сталі традыцыяй літаратуры ўжо другой паловы XX стагоддзя. У тым ліку слоўнага мастацтва, створанага паэтамі пасляваеннага ці, як яго яшчэ называюць, філалагічнага пакалення. Менавіта гэты выказаны намі тэзіс паспрабуем канкрэтызаваць і сцвердзіць назіраннямі над асаблівасцямі паэтыкі Янкі Сіпакова.

У апошні час літаратуразнаўства ўсё часцей пачынае аперыраваць паняццем мастацкай дэталі. Дэталь – гэта сапраўды найвялікшае вынаходніцтва стварэння мастацкай мадэлі свету. Апісальна можна бясконца характарызаваць які-небудзь прадмет ці з'яву, мастацкая ж дэталь адной характэрнай рысай адкрывае сакрэт, самае істотнае ў вобразе як жывым, яскравым адбітку рэальнага (а можа, нават і надрэальнага, створанага фантазіяй аўтара) жыцця. Думаецца, што яе вызначэнне, больш-менш набліжанае да адноснай ісціны, далі аўтары цікавай манаграфіі "Пытанні паэтыкі", што выйшла яшчэ ў так званы "застойны" час: "Дэталь і ёсць

перш за ўсё характэрная, эстэтычна-асэнсаваная, выбраная прыватнасць, якая "ўзбуджае" ўяўленне аб прадмеце, вызначае як бы нейкую хітрынку, сакрэт вобраза, тое, што не заўсёды выкажаш лагічным пераказам" (1, 117).

Янка Сіпакоў у вершы "Тураўская элегія" пры апісанні былога "магутнага, стольнага" горада ўжывае такі выраз, што з'яўляецца трапнай мастацкай дэталлю, якая паказвае на няспынны і жорсткі ход часу, гісторыі: *прысеў горад*. Паэт сцвярджае гэтай дэталлю значную філасофскую ідэю – нават самае вялікае і моцнае пастулова здрабняецца, пакрываецца хвалямі разбурэння няўмольнага часу, і абавязак нашчадкаў — не забывацца пра гэта, памятаць і шанаваць сваю гісторыю:

Як прысеў ты, драўляны горад!
З крэктам з замкавай споўз гары. (3,83)

Дэталь і ёсць перш за ўсё нейкая свежая, раптоўная, прыкмечаная вокам толькі сапраўднага, таленавітага мастака "жывінка", якая вылучаецца з мноства характарыстык прадмета ці з'явы. Не абавязкова гэта павінна быць самае асноўнае, але яна, гэтая дэталь, нейкім чынам праз раптоўна схопленую пабочную рысу абуджае ў свядомасці чытача цэлы рой асацыяцыяў, мінаючы паслядоўную лагічную сувязь прамежкавых ступеняў, нараджае вобраз, асвятляе і дамалёўвае ўсю карціну. Так, яшчэ ў адным сваім вершы Янка Сіпакоў удала выкарыстоўвае мастацкую дэталь, якая ў двух словах раскрывае сутнасць і характар чалавека, які не можа прайсці раўнадушна каля любых прадметаў і з'яваў, а хоча абавязкова дазнацца пра іх сутнасць, якога літаральна ўсё турбуе і хвалюе. І называе такога чалавека аўтар "вуглаватым". Гэты "вуглаваты" чалавек чапляецца за ўсё на зямлі: за лясы, за хаты, за сляты, за моды, за густы, за сынавы ручаняты, за пах капусты, за неба, за зоры, за гнёзды. Як адзначаюць многія літаратуразнаўцы, пісьменнік павінен акрэсліць тыя падрабязнасці, праз якія больш за ўсё выяўляецца душа гэтых прадметаў і якія, быццам бліскавіца, асвятляюць шырокую і стракатую панараму новастворанай ім рэальнасці (ці нібы-рэальнасці).

Як жа паэт выбірае тое адзінае слова, якое ў яго таленавітых руках стане мастацкай дэталлю, а затым, пастаўленае ў кантэкст мастацкага выказвання, акажа моцнае ўздзеянне на чытача? Прынцыпы, паводле якіх пісьменнік падбірае часцінкі-дэталі, даволі простыя: ён, як і мы, звычайныя людзі, кіруецца законамі ўспрымання, запамінання і вылучэння з усяго заўважанага галоўнага, істотнага і

характэрнага, кіруючыся ўласнымі густамі, перакананнямі, ідэаламі. Гэтаксама па асобных, ледзь прыкметных, але характэрных рухах, рысах мы пазнаём характары незнаёмых людзей. Калі б гэта было інакш, аўтару цяжка было б павесці за сабой чытача. Звычайна трапную дэталь-знаходку паэта мы заўсёды прачытваем з павышаным эмацыянальным пачуццём: вось як добра сказана, як дакладна! Мы ж пра гэта ведалі даўно, разумелі ўсё гэта, а выказацца пра яго так хораша не маглі! Самы галоўны закон стварэння мастацкіх дэталяў — гэта вылучэнне вядучай канкрэтнай прыкметы ў з'яве (ці некалькі прыкметаў, але, часцей, — нямногіх) і ўзнаўленне цэлага па малому ліку дамінуючых рысаў (ці не свайго роду тыпізацыя, уласцівая рэалістычнаму тыпу творчасці?).

У вершы "Знойдзенае завяшчанне багацея" выдатнай творчай знаходкай паэта Сіпакова з'яўляецца сама назва твора, што выступае ў якасці мастацкай дэталі, — "завяшчанне багацея". Менавіта з загалоўка становіцца зразумелы глыбокі падтэкст верша: сапраўдныя каштоўнасці заключаюцца не ў матэрыяльным дабрабыце, не ў грошах і золаце, а ў радасцях і пакутах, што даруе нам ад нараджэння жыццё. Многія загалоўкі Купалавых вершаў у свой час таксама станавіліся шматзначнымі, філасофскімі мастацкімі дэталямі — "Курган", "Спадчына", "Тутэйшыя", "Прарок", "У дарозе", "Груган", "Беларускія сыны", "Раскіданае гняздо". Што ні назва — то маштабная ацэнка магчымасцяў чалавека, яго месца ў прыродзе, у гістарычным працэсе, вызначальных фактараў яго існавання і існавання народа, да якога ён належыць.

Памяць на мастацкія дэталі, уменне бачыць трапную падрабязнасць у тым, што для звычайных людзей — проста не вартая ўвагі дробязь, — гэта вельмі важная грань і паэзіі ў цэлым, і яе асобных творцаў:

Сапраўдныя сібіракі!
І толькі ў хаце
Іх выдаюць старэнькія цымбалы,
Дзе струны, быццам правады
Над доўгаю дарогаю у край той,
Адкуль сюды прыйшлі яны
Даўно... (3,79)

У прыведзеным вершы аўтар выкарыстоўвае трапную мастацкую дэталь пры апісанні сібіракоў — выхадцаў з Беларусі, шматпакутных перасяленцаў, прыгадваючы наш народны музычны інструмент — старэнькія цымбалы,

струны якіх нагадваюць *правады* над доўгаю дарогай у родны край, на Беларусь.

Адзначым, што апошнім часам у крытычнай літаратуры часта ўжываецца тэрмін "асацыятыўная вобразнасць" замест тэрміна "мастацкая дэталь". На нашу думку, гэта заканамерна і цалкам справядліва, бо і ў першым, і ў другім выпадках літаратуразнаўцы часцей за ўсё разумеюць міні-вобразы, тропы, у якіх нечакана суадносяцца розныя — канкрэтныя і абстрактныя, рэальныя і надрэальныя — з'явы, бывае, вельмі аддаленыя, хоць і звязаныя ледзь прыкметным адзінствам па значэнню. Падобная вобразнасць, магчыма, ідзе ў пэўнай ступені з даўніх часоў, з перыяду атаясамлівання чалавекам прыроды з самім сабой, калі для чалавека абстрактнае ўвасаблялася ў канкрэтным, а кожная рэальна існуючая з'ява напаўнялася сімвалічным значэннем. Магчыма, у наш час мы і вяртаемся (хоць гэта і гіпатэтычнае меркаванне) да адраджэння падобнага старажытнаму сінкрэтычнага мастацтва на новым вітку развіцця зямной цывілізацыі? Як бы там ні было, але як мастацкая дэталь, так і тропы і іх разнавіднасці — сімвалы, метафары, алегорыі і г.д. — маюць несумненнае падабенства ў сваёй маштабнасці, шматзначнасці, у "сінкрэтызме" многіх і многіх адзнак. Імі ўдала карыстаецца сучасная беларуская літаратура, у тым ліку — слоўнае мастацтва, створанае прадстаўнікамі філалагічнага пакалення.

Вобразная сімволіка шырока выкарыстоўваецца ва ўсіх родах і жанрах слоўнага мастацтва, таму што кожны вобраз заключае ў сабе адзнакі сімвалізму, знакавасці, у той ці іншай ступені паказвае на сувязь агульнага і адзінкавага, знешняга і ўнутранага, рэчыўнага і абстрактнага, фізіялагічнага і духоўнага. Так, напрыклад, у вершы Янкі Сіпакова "Белыя вароны" адразу кідаецца ў вочы вобраз-сімвал "белыя вароны", які і патлумачваецца ў эпіграфе да твора — так кажуць пра тых, хто "не ўмее жыць". Для паэзіі прадстаўнікоў філалагічнага пакалення вобраз гэты даволі нечаканы і новы, бо менавіта гэта пакаленне доўгі час верыла ў сваю злітнасць з грамадствам, летуценіла ў марах пра будучыню, канстатавала факт пазбаўлення ад крывадушша і фальшу ў сярэдзіне 50-х — 60-я гады. Аднак пазней наступіла расчараванне. Мастакі адчулі сваю адчужанасць і вуглаватасць у знешне нармальным і ўпарадкаваным рэчышчы жыцця. "Белая варона" — ролевы герой паэзіі Сіпакова, многімі рысамі сваімі блізкі да дзівака Галілея з "Вязьма" Зарэцкага, духоўна неўладкаваных герояў

незакончаных раманаў Чорнага "Млечны шлях", "Вялікі дзень" і "Пошукі будучыні", "чорнага вала" Куляшова і г.д. Яму, як і падобным да яго іншым героям, няўтульна і сцюжна на зямлі:

Трывожна ў небе *крыляе*
Чародка белых варон.
У іх вачыма страляюць,
Рагочуць ім наўздагон. (3,161)

Увогуле, белы колер вельмі часта выкарыстоўваецца Янкам Сіпаковым як сімвал нечага новага, чыстага і светлага, як знак некранутай, нечапанай радасці, высокай духоўнасці:

Чысцінёй *святліцца* слова...
Новы год. Бялюткі снег. (3,123)

У пачатку артыкула мы пісалі пра Купалаву прагу наватарства, якім можна выказаць сябе найвыразней, найярчэй. Ці не падобнай прагай ахоплены і Сіпакоў, і многія яго аднагодкі (сярод іх першы – Рыгор Барадулін).

У прыведзеных намі ўрыўках – два наватворы. Ды якія! Праз іх адкрываецца гуманістычны настрой мастака, аўтарава захапленне жыццём гарманічным і добрым, прыродным. Гэтыя наватворы – *крыляе* і *святліцца* – ужо самі сабой – мастацкія дэталі, тропы. Дарэчы, наватвор "крыляць" у новай форме, але ў зыходным, гуманістычным значэнні паўторыцца ў многіх іншых паэтавых творах, у тым ліку і вось у гэтым:

Вы кажаце, гэта дзед? Гэта ж бацька,
Што столькі сыноў *павыкрыльваў* у людзі,
А сам са старою застаўся ў прасторным, астылым
гняздзе.(3,173)

У вядомай манаграфіі А.Ф.Лосева падкрэсліваецца, што найважнейшая значнасць сімвалаў заключаецца ў тым, што ў іх замацоўваюцца і паэтызуюцца спрадвечныя, агульначалавечыя ідэалы, што яны "з'яўляюцца або прароцтвам, або падвядзеннем вынікаў найвялікшых чалавечых катастрофаў і ўяўляюць сабой танюткія і найвастрэйшыя інструменты для арыентацыі ў гэтых катастрофах, а таксама і метады іх пераадолення" (2, 202). Галоўнае ў сімвале тое, што ён заўсёды імкнецца за межы свайго канкрэтнага значэння, напаўняецца невычэрпнай энергіяй, што нараджае адну за адной паралелі і асацыяцыі. Сімвал з'яўляецца тады, калі мастак вельмі вялікі "аб'ём" пачуцця, якую-небудзь значную ідэю, які-небудзь агульназначны факт хоча падаць чытачу наглядна, прадметна, вобразна, не пры дапамозе пераказвання абстрактнай думкі, а

праз рэалію, што непасрэдна ўздзейнічае на наша зрокавае, эмацыянальна-пачуццёвае ўспрыманне.

Побач з адназначнымі падобнымі сімваламі Янка Сіпакоў шырока карыстаецца сімваламі, значэнне і змест якіх далёка не адназначныя. Прыкладам такіх з'яўляецца яго вобраз-сімвал "агонь". Па-першае, ім выражаецца (выказваецца) ўнутраная сутнасць, духоўнасць чалавечага "я", па-другое – ён азначае вялікае гора, страшэннае няшчасце, бяду, нават магчымую вайну, а па-трэцяе – неўміручае каханне:

Мой агонь пастарэў на год,
Маё вогнішча вечарэе. (3, 128)
Памерці ад нянавісці
Пасярод звар'яцелага агню,
Які, з паразяўлянымі пашчамі,
Вартуюць аўчаркі, аўтаматы і...
Людзі... (3, 170)

Вельмі часта карыстаецца паэт вобразам-сімвалам (ці не архетыпам для беларускага слоўнага мастацтва?) "зерне". Для яго, паводле яго канцэпцыі, гэты вобраз азначае і непарыўнае абнаўленне жыцця, і нараджэнне новага, і еднасць чалавека з прыродай, і пачатак усяго на свеце, і шмат што іншае ("О, зернетка – гэта ўжо работа", "зерне праганяе адзіноту", "Малое зерне месціць цэлы свет" (3,101). Нават назвы вершаў і асобных зборнікаў паэта ператвараюцца ў сімвалы: "У поўдзень, да вады" ( у пошуку гаючай, наталяючай смагу радасці і праўды, высокага поўдня, дабрыні і справядлівасці), "Веча славянскіх балад" ( у памкненні да яднання, аднадушша ў вырашэнні складаных пытанняў узаемаадносінаў паміж людзьмі, гарманічнага жыццебудавання).

Такім чынам, Янка Сіпакоў у многім ідзе ў літаратуры Купалавым шляхам: шляхам канцэнтрацыі думак, пачуццяў, сэнсу ў творах, сінтэзу многіх пачаткаў у адным цэлым, выяўлення на малой плошчы шматзначнага, яскравага, характэрнага. Шырыня "мыслення вершамі" (у слоўным мастацтве сучаснасці такое назіраецца вельмі часта) у абодвух мастакоў выклікае да жыцця адпаведную вобразнасць, што выяўляе ў сваю чаргу імкненне літаратуры да сінтэзу фармальных і змястоўных прыкметаў.

## Спасылкі:

[1] Жураўлёў В.П., Шпакоўскі І.С., Яскевіч А.С. Пытанні паэтыкі. — Мн., 1974. — С. 117.

[2] Лосев А.Ф. Проблема символа и реалистическое искусство. — М., 1976. — С. 202.

[3] Сіпакоў Я. Выбраныя творы: У 2 т. Т.1. Паэзія. — Мн., 1995. — С. 83, 79, 128, 161, 173, 170.

*С.І.Ханеня*
*(Гомель)*

## ДЭМАНАЛАГІЧНЫ СВЕТ ЯНКІ КУПАЛЫ І МІФАЛАГІЧНЫЯ ПОШУКІ МАЛАДЫХ

Як вядома, у мастацтве існуюць дзве асноўныя формы адлюстравання рэчаіснасці. Адна з іх падразумявае неабходнасць захавання знешняга аблічча свету, другая катэгарычна адмаўляе згаданы пастулат. Свядомае парушэнне знешняга падабенства жыцця — адна з адметных асаблівасцей сучаснага літаратурнага працэсу. У прыватнасці, пашырэнне “міфалагічнай” прозы ўласціва пакаленню пісьменнікаў, што ўвасабляюць “новую хвалю” беларускай літаратуры, якія ў сваёй творчасці звяртаюцца не толькі да фальклорных скарбаў, але часам імкнуцца выйсці за межы традыцыйнага міфа. Фантастычна-міфалагічны тып мастацкага абагульнення дазваляе пазбегнуць адзінкавасці, выпадковасці, нязначнасці і ахапіць сутнасць з'явы, а больш глыбока — самога жыцця, па-філасофску асэнсаваць існаванне як асобы, так і чалавецтва. Зварот да міфалагічнага — гэта і своеасаблівы пошук спрадвечнага, існага, што можа не толькі супрацьстаяць, але і адолець часовыя ілжывыя каштоўнасці сучаснай цывілізацыі, спасцігнуць блытаніну, складанасць сённяшняга свету. Не апошнюю ролю ў распаўсюджванні міфалагічнай плыні ў нашай літаратуры адыгрываюць надзвычай багаты і разнастайны фальклор беларусаў, а таксама традыцыі нашай літаратуры, перш за ўсё, творчы вопыт Я.Купалы. Цікавасць да спадчыны народнага паэта ў наш час зусім не выпадковая, бо яшчэ доўга мы будзем ацэньваць стан і ўзровень новастворанага беларускім пісьменствам праз прызму таленту Я.Купалы. Бо ён — момант ісціны нашай літаратуры; калі ў свой час А.Рэмбо адкрыў колеры галосных, то Я.Купала здолеў